# Беларуская Думка

№ 7 2021
ЛІПЕНЬ



**Владимир КАРАНИК: «У каждого района есть потенциал для развития»**

**АПОШНЯЯ З ВОГНЕННЫХ ВЁСАК**
Сведчанні следчага

**ОСТРОВ ДУ**
Путешествуем по родному краю

**«КОСМИЧЕСКИЙ» ЧЕЛОВЕК СОЮЗНОГО ГОСУДАРСТВА**
Эксперты Беларуси и России – о цифровой интеграции

ISSN 0023-3102
9 770023 310004 21007

Беларуская Думка
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ І НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ ЧАСОПІС
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Выходзіць 1 раз у месяц
ISSN 0023-3102
№ 7 (ЛІПЕНЬ) 2021

ЗАСНАВАЛЬНІК – АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ВЫДАВЕЦ – УП «БелТА»
Генеральны дырэктар УП «БелТА»
Ірына Барысаўна АКУЛОВІЧ

**Галоўны рэдактар**
Ігар Сяргеевіч ГАНЧАРУК

**Намеснік галоўнага рэдактара**
Ганна МАСЛЯКОВА

**Навукова-рэдакцыйны савет:**
В.І. Бельскі, С.П. Вінакурава, А.Я. Гучок, А.А. Каваленя (старшыня), С.А. Кізіма, Ч.С. Кірвель, А.М. Косінец, І.А. Марзалюк, У.А. Мельнік, М.У. Мясніковіч, Д.Г. Ротман, І.В. Саверчанка, І.А. Чарота, С.А. Шавель

Функцыі рэдакцыйнай калегіі выконвае калегія УП «БелТА»

**Адрас рэдакцыі**
220030, г. Мінск, вул. Энгельса, 30,
тэл.: 379-55-13, 392-24-33, тэл./факс: 373-15-55
e-mail: beldumka@belta.by
www.beldumka.belta.by
Юрыдычны адрас: 220030, г. Мінск, вул. Кірава, 26
oper@belta.by

**Падпісныя індэксы**
74938 (індывідуальная падпіска)
749382 (ведамасная падпіска)

**Пасведчанне аб рэгістрацыі**
№ 6 ад 31 сакавіка 2009 г. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Дызайн, вёрстка:**
Іван МІЦКЕВІЧ

**Рэдагаванне, карэктура:**
Святлана КАРПУЧОК

Фота БЕЛТА

Падпісана ў друк 20.07.2021.
Дата выхаду 27.07.2021.
Тыраж 2034 экз. Заказ 675.

Цана свабодная.

Надрукавана Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «БудМедыяПраект», 220123, г. Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.
Ліцэнзія ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014.

© «Беларуская думка», 2021
© УП «БелТА», 2021

# [ ЗМЕСТ ]

[ VIII ФОРУМ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ ]

Игорь СЕРГЕЕВ
СТАВКА НА ЦИФРУ ..... 3
О чем договорились на форуме

[ ПРЫЯРЫТЭТЫ. МОЦНЫЯ РЭГІЁНЫ ]

ВЛАДИМИР КАРАНИК: «У КАЖДОГО РАЙОНА ЕСТЬ ПОТЕНЦИАЛ ДЛЯ РАЗВИТИЯ» ..... 5

[ САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА ]

Снежана МИХАЙЛОВСКАЯ
КЛЮЧ К ЦИФРОВОМУ БУДУЩЕМУ ..... 12

[ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС ]

Леонид КРИВОНОС
НЕ ХУЖЕ, ЧЕМ В ГОРОДЕ ..... 20
Именно так стремятся обслуживать сельских жителей кооператоры. Получается ли?

[ ЛЮДЗІ НАВУКІ ]

Светлана ДВОРЕЦКАЯ
ДАЧНЫЕ РАДОСТИ АКАДЕМИКА РЕШЕТНИКОВА ..... 25
«Беларуская думка» побывала в гостях у известного ученого

[ ДАЛЁКАЕ – БЛІЗКАЕ ]

Таццяна ПАДАЛЯК
ТРАГЕДЫЯ ДАЛЬВЫ: СВЕДЧАННІ СЛЕДЧАГА ..... 31
Пра што нагадала архіўная папка

[ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ ]

Александр КАРАБЛИКОВ
ИСЧЕЗНУВШИЙ МИР ..... 38
Нескромное обаяние еврейских местечек Беларуси

[ БЕЛАРУСЬ INCOGNITA ]

Григорий СОЛОНЕЦ
ОСТРОВ ДУ ..... 45
Здесь рай земной, считают бывалые туристы

НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА
ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА
ГрДУ імя Я. Купалы

[ ЗМЕСТ ]

## НАВУКА. ДАСЛЕДАВАННІ. РАСПРАЦОЎКІ


НАВІНЫ НАВУКІ ... 50

[ ПАЛІТЫКА ]

Виталий СТАХОВСКИЙ, Юрий ЯРМОЛИНСКИЙ
О НОВОМ ФОРМАТЕ МНОГОВЕКТОРНОСТИ ... 52

[ САЦЫЯЛОГІЯ ]

Анастасия БОБРОВА, Алексей ЖИВИЦА
СЕМЕЙНАЯ ПОЛИТИКА В БЕЛАРУСИ – ПРИОРИТЕТ СОЦИАЛЬНОЙ И ДЕМОГРАФИЧЕСКОЙ ПОЛИТИКИ ... 58

[ ЭКАНОМІКА ]

Александр ИГНАТЮК
СОЗДАНИЕ МОДЕЛИ МОТИВАЦИИ ПЕРСОНАЛА НА ОСНОВЕ ФУНКЦИОНАЛЬНЫХ ЦЕПОЧЕК ЦЕННОСТЕЙ ... 66

[ ГІСТОРЫЯ ]

Аляксандр ГОРНЫ
МЕСЦА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў БЕЛАРУСКІМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ РУХУ (1923–1938) ... 72

Александр СЛЕСАРЕВ
ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ ИЕРАРХОВ АВТОКЕФАЛЬНОЙ БЕЛОРУССКОЙ МИТРОПОЛИИ В ДИАСПОРЕ С АНТИСОВЕТСКИМИ ВООРУЖЕННЫМИ ФОРМИРОВАНИЯМИ В 1944–1945 ГОДАХ ... 78

Виктор БЕЛОЗОРОВИЧ
ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ИНСТИТУТА ИСТОРИИ ПАРТИИ И ОКТЯБРЬСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ ПРИ ЦК КП(б)Б (1929–1938 ГОДЫ) ... 83

ХУАН Куньпэн
ДИПЛОМАТИЯ ГЛОБАЛЬНОГО ОБЩЕСТВЕННОГО ЗДРАВООХРАНЕНИЯ И УЧАСТИЕ В НЕЙ КИТАЯ ... 89

[ ФІЛАСОФІЯ ]

Юлия БАНЬКОВСКАЯ
МЕХАНИЗМЫ РЕГУЛИРОВАНИЯ СЕТЕВЫХ КОНФЛИКТОВ ... 93

[ ФІЛАЛОГІЯ ]

Ірына УКРАЖЭНКО
ФАЛЬКЛОРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ: МЕХАНІЗМЫ ІХ ЗАХАВАННЯ І ЎПЛЫЎ НА ФАРМІРАВАННЕ ДУХОЎНАСЦІ НАЦЫІ ... 98

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА ... 104




**«БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»** — пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Лепшы навуковы, навукова-папулярны часопіс», IX Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» і XVI Нацыянальнага конкурсу «Залатая літара» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

### АБ ВЫДАННІ

Часопіс выходзіць на беларускай, рускай і англійскай мовах. Аўтары апублікаваных матэрыялаў у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў і звестак. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Перадрукоўванне дазваляецца па ўзгадненні з рэдакцыяй, спасылка на часопіс «Беларуская думка» абавязковая.

### НЯШТАТНЫМ АЎТАРАМ

У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 01.04.2014 года № 94 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 16.02.2021 года № 36) часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, філалагічных, філасофскіх, эканамічных і сацыялагічных навуках.

# Месца Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў беларускім нацыянальным руху (1923–1938)

УДК 930(476)(1921–1939)



**Аляксандр ГОРНЫ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

**Аляксандр ГОРНЫ. Месца Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў беларускім нацыянальным руху (1923–1938).** Аўтар на аснове аналізу малавядомых фактаў з архіўных крыніц спрабуе пераасэнсаваць месца Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў беларускім нацыянальным руху ў міжваеннай Польшчы. Савецкая гістарыяграфія разглядала дзейнасць КПЗБ як праяву інтэрнацыянальнага камуністычнага руху. У артыкуле зроблены акцэнт на вызначэнні КПЗБ як важнай часткі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, які складаўся з розных плыняў. КПЗБ, як і іншыя беларускія арганізацыі розных кірункаў, імкнулася да стварэння беларускай дзяржаўнасці і ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. У межах антрапалагічнага павароту ў гістарыяграфіі прадстаўлены «калектыўны партрэт» партыйнага актывіста, праводзіцца аналіз легальных і нелегальных форм дзейнасці партыі.

**Ключавыя словы:** Заходняя Беларусь, міжваенны перыяд, беларускі нацыянальны рух, нацыянальнае пытанне, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі.

**Aliaksandr GORNY. Role of the Communist Party of Western Belarus in the Belarusian national movement (1923–1938).** Based on the analysis of the little known archival sources, the author attempts to rethink the role and place of the Communist Party of Western Belarus (CPWB) in the social and political life in interwar Poland. Soviet historiography viewed the activities of the CPWB as a manifestation of the international communist movement. The article emphasizes the important role of the CPWB in the Belarusian national liberation movement, which embraced many ideologies. The CPWB, like other Belarusian organizations, sought to create Belarusian statehood and strengthen the national identity of Belarusians. As part of the historical anthropology, the article paints a "collective portrait" of the party activist and analyzes the legal and illegal forms of party activities.

**Keywords:** Western Belarus, interwar period, Belarusian national movement, national question, Communist Party of Western Belarus.

**У міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі разгарнулі сваю дзейнасць розныя беларускія палітычныя і культурна-асветніцкія арганізацыі, што было сведчаннем развіцця моцных нацыянальных працэсаў у гэтым рэгіёне. Перашкоду нацыянальнаму ўздыму аказвалі польскія ўлады, якія праводзілі палітыку дэнацыяналізацыі мясцовага беларускага насельніцтва. Гэта праяўлялася ў закрыцці беларускіх адукацыйных ініцыятыў, культурна-асветніцкіх праектаў, звужэнні грамадска-палітычнага жыцця. Ва ўмовах барацьбы беларусаў за сваё нацыянальнае «Я» асобнае месца належала**

## ПРА АЎТАРА

ГОРНЫ Аляксандр Сяргеевіч.

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1988 года ў г. Гродне.

Скончыў факультэт гісторыі і сацыялогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта (ГрДУ) імя Янкі Купалы (2011).

З 2015 года працуе ў ГрДУ імя Янкі Купалы на пасадах выкладчыка-стажора, старшага выкладчыка, з 2018 года – дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

Старшыня Савета маладых вучоных ГрДУ імя Янкі Купалы. З 2018 года – дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

У 2020 годзе прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным.

Кандыдат гістарычных навук (2016), дацэнт (2020).

Аўтар 70 навуковых публікацый, у тым ліку дзвюх калектыўных манаграфій, аднаго даведачнага выдання.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускага нацыянальнага руху ў XX стагоддзі, палітычная і канфесійная гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, гісторыя беларускай дыяспары, гісторыя паўсядзённасці.



pawet.net

Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), якая спалучала ў сваёй дзейнасці легальныя і нелегальныя сродкі барацьбы. Сёння роля КПЗБ у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, нягледзячы на вялікую колькасць гістарычных даследаванняў, не пераасэнсавана з улікам новых фактаў і метадалагічных падыходаў.



**Барыс Махляр – актывіст КПЗБ з в. Вялікая Лотва Ляхавіцкага раёна. 1934 год**

У беларускай савецкай гістарыяграфіі існаваў канон, паводле якога КПЗБ лічылася авангардам «рэвалюцыйнай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі», а яе «інтэрнацыянальная» дзейнасць размяжоўвалася з дзейнасцю іншых структур беларускага нацыянальнага руху, асабліва некамуністычных *[1, с. 5]*. Напрыклад, беларускі савецкі гісторык Т. Глінская ў сваёй манаграфіі, выдадзенай у 1965 годзе, называла КПЗБ «кіраўніком вызваленчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі ў 1924–1928 гг.», а іншыя беларускія арганізацыі, не звязаныя ідэйна з камуністамі, запісала ў разрад «беларускіх буржуазных нацыяналістаў» *[2, с. 194]*. Падобныя ацэнкі выказвалі і іншыя савецкія гісторыкі, якія ў 1960–1980-х гадах падрыхтавалі грунтоўныя фактaлагічныя даследаванні па гісторыі КПЗБ, у прыватнасці У. Палуян, І. Палуян, П. Зялінскі, У. Ладысеў, Г. Ватковіч і інш. Увогуле ў савецкі перыяд гісторыя КПЗБ была даследавана ў пяці доктарскіх дысертацыях. Аднак ва ўсіх гэтых працах, як падкрэслівае сучасны беларускі гісторык А. Савіч, за КПЗБ замацоўваўся «імідж бадай што адзінай палітычнай сілы, якая паслядоўна, з „правільных" пазіцый ажыццяўляла кіраўніцтва барацьбой за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне» *[3, с. 190]*.

Сучасная беларуская гістарычная навука, змяніўшы метадалагічныя акцэнты, у шмат чым захавала ранейшы «дуалістычны» погляд на развіццё беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі. Беларускія даследчыкі на сучасным этапе разглядаюць дзейнасць КПЗБ асобна ад іншых беларускіх структур, не ўпісваючы яе ў агульны кантэкст развіцця беларускага руху *[4, с. 392–405]*. Больш за тое, па-ранейшаму падкрэсліваецца накіраванасць КПЗБ на вырашэнне ў першую чаргу сацыяльна-эканамічных праблем, а нацыянальная ангажаванасць партыі пры гэтым ставіцца на другі план. Паказальна, што ў 1990–2000-я гады ў беларускай гістарыяграфіі, нягледзячы на значны навуковы прарыў у вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі, не было зроблена спроб грунтоўна пераасэнсаваць дзейнасць КПЗБ з улікам новых падыходаў і арганічна звязаць яе з іншымі праявамі барацьбы беларусаў за свае нацыянальныя правы ў міжваеннай Польшчы. Выяўленыя дакументальныя крыніцы дазваляюць разглядаць беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі як цэласную сістэму, якая складалася з розных плыняў і кірункаў, але імкнулася да адной і той жа мэты – стварэння беларускай дзяржаўнасці. КПЗБ з'яўлялася важнай часткай гэтай сістэмы, без якой яна не мела бы паўнавартаснага абрысу.

КПЗБ была ўтворана ў 1923 годзе як аўтаномная частка Камуністычнай партыі Польшчы (КПП). Першапачаткова ў яе склад уваходзілі невялікія камуністычныя групы, якія былі раскіданы па абшарах Заходняй Беларусі. Да партыі далучыліся таксама левыя эсэры з Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, якія стварылі дастаткова арганізаванае кіраўнічае звяно ў партыйных структурах. Менавіта гэтыя дзеячы, прынамсі І. Лагіновіч, Л. Родзевіч, А. Канчэўскі і інш., якія былі звязаны з левaрадыкальным эсэраўскім рухам, прыўнеслі ва ўнутрыпартыйнае жыццё значны нацыянальны пасыл *[5, с. 49]*. Не маючы праграмы і статута, КПЗБ кіравалася ў сваёй дзейнасці агульнымі праграмнымі дакументамі польскіх камуністаў, а таксама выніковымі дакументамі ўласных пленумаў, канферэнцый і з'ездаў. Згодна з імі партыя выступала за сацыялістычную рэвалюцыю ў Польшчы, усталяванне дыктатуры пралетарыяту, канфіскацыю памешчыцкіх зямель і ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР *[1, с. 69]*.

Беларускія савецкія гісторыкі ў сваіх даследаваннях падкрэслівалі, што КПЗБ на працягу ўсёй сваёй дзейнасці кіравалася «вучэннем марксізму-ленінізму» *[6, с. 4]*. Аднак, па сутнасці, КПЗБ не з'яўлялася класічнай камуністычнай партыяй ленінскага ўзору. У яе межах спалучаліся розныя плыні тагачаснага левaрадыкальнага дыскурсу – ад левых беларускіх дзеячаў, для якіх камунізм быў толькі сродкам барацьбы з польскай акупацыяй Заходняй Беларусі, да перакананых марксістаў. У 1930-я гады ў партыі дзейнічалі нават невялікія трацкісцкія групоўкі *[7, арк. 1–3]*. Узорам адсутнасці

ідэалагічнай цэласнасці ў КПЗБ могуць быць шматлікія ўнутрыпартыйныя дыскусіі, як, напрыклад, вядомая «сэцэсія» 1924–1925 гадоў ці фракцыйная барацьба «большасці» і «меншасці» ў 1926–1930 гадах. *[1, с. 98, 160]*.

Будзе справядлівым называць сяброў КПЗБ не артадаксальнымі камуністамі, а левардыкаламі, якіх аб'ядноўвала ідэя рэвалюцыйных перамен у лёсе Заходняй Беларусі і вызвалення з-пад польскага панавання. Пры гэтым важным для большасці актывістаў менавіта на нізавых партыйных структурах былі не столькі радыкальныя сацыяльныя лозунгі, колькі нацыянальная барацьба, якая павінна была прывесці да ўз'яднання беларускага народа. Узнікала сітуацыя, калі партыйнае кіраўніцтва ў рамках праграмных дакументаў прытрымлівалася інтэрнацыянальнай рыторыкі, а ў правінцыйных асяродках КПЗБ на першае месца выходзіла нацыянальнае пытанне. Напрыклад, у 1934 годзе прадстаўнік ЦК партыі паведамляў, што ў вясковых ячэйках, раённых і нават некаторых акружных камітэтах назіраліся вельмі моцныя нацыянальныя беларускія настроі *[8, арк. 115]*. Падобны «дысбаланс» захоўваўся фактычна да 1935 года, калі падчас II з'езда партыі кіраўніцтвам была прызнана недаацэнка важнасці барацьбы супраць нацыянальнага ўціску *[1, с. 320]*. Гэтыя працэсы на палітычнай сцэне Заходняй Беларусі цалкам адпавядалі сусветнай практыцы развіцця нацыянальных рухаў – многія нацыянальна арыентаваныя палітычныя арганізацыі (напрыклад, Бунд, Польская сацыялістычная партыя і інш.) у канцы XIX – першай палове XX стагоддзя мелі левардыкальнае адценне *[9, p. 189–190]*.

У міжваенны перыяд КПЗБ мела добра арганізаваную канспіратыўную сетку сваіх сяброў, чаго не мелі іншыя беларускія палітычныя арганізацыі. Заходнебеларускія левардыкалы дэманстратыўна не прызнавалі тагачасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Польшчы і стварылі ўласную вертыкальную і тэрытарыяльную структуры, якія пры спрыяльных умовах змены ўлады маглі адразу выконваць кіруючыя функцыі. На месцах ствараліся партыйныя ячэйкі – тры ячэйкі мелі права аб'ядноўвацца ў падраённыя ці раённыя камітэты. Некалькі раённых камітэтаў аб'ядноўваліся ў акружны камітэт, які меў непасрэдныя зносіны з партыйным ЦК праз сваіх «тэхнікаў» ці інструктараў *[10, арк. 8 адв.]*. У 1930-я гады – перыяд найбольшага росквіту дзейнасці КПЗБ – у Заходняй Беларусі дзейнічала 12 акружных камітэтаў партыі: віленскі, маладзечанскі, лідскі, браслаўскі, глыбоцкі, навагрудскі, слонімскі (раней – баранавіцкі), гродзенскі, беластоцкі, ваўкавыскі, брэсцкі і пінскі. Найбольш арганізаваным і колькасным быў амаль увесь час беластоцкі камітэт, найменш прадстаўнічым – віленскі камітэт, у склад якога магло ўваходзіць усяго да 20 актывістаў *[8, арк. 13 адв.]*. Хто былі гэтыя людзі, якія вырашылі звязаць свой лёс з КПЗБ?

Звычайна ў гарадах і мястэчках партыйны актыў складалі яўрэі – рабочыя мясцовых фабрык ці дробных прадпрыемстваў. Аднак працэнт гарадскіх жыхароў у складзе «пралетарскай партыі» быў, як не дзіўна, адносна невялікі – у гарадах тагачаснай Польшчы рэй вялі больш моцныя і вопытныя яўрэйскія ці польскія сацыялістычныя арганізацыі. Напрыклад, у 1928 годзе толькі 10,5 % партыйных актывістаў пражывала ў гарадах Заходняй Беларусі *[11, арк. 87]*. Большасць сяброў партыі складалі якраз звычайныя беларускія сяляне. Праглядзенне кантэнт-аналізу партыйнага справаводства і польскіх паліцэйскіх рапартаў дазваляе скласці «калектыўны партрэт» звычайнага кпзбоўца тых часоў: малады хлопец 20–25 гадоў, нежанаты, які жыў на вёсцы і займаўся сельскай гаспадаркай, у асноўным праваслаўнага веравызнання. Ён амаль не ведаў польскай мовы і ў дзяцінстве перажыў бежанства часоў Першай сусветнай вайны, падчас якога, напэўна, паспеў павучыцца нават у савецкай школе *[12, арк. 3, 10, 14, 18, 35, 46]*. Пры гэтым яго маладыя марксісцкія ідэалы часта саступалі месца нацыянальным пачуццям. Адносна невялікай была доля жанчын у складзе КПЗБ. У прыватнасці, у брэсцкім акружным камітэце ў 1924 годзе сярод усіх актывістаў налічвалася толькі 1,6 % жанчын *[13, арк. 103]*. Тым не менш, калі параўноўваць з іншымі беларускімі арганізацыямі, то працэнт ангажаванасці жанчын у палітычнай дзейнасці быў найвышэйшы менавіта ў КПЗБ. Такім чынам, КПЗБ была з большага арганізацыяй беларускіх сялян, якія спрабавалі змагацца за сваё нацыянальнае «я» з моднымі левымі лозунгамі на вуснах. Менавіта нацыянальная складовая ў гэтай партыі дазваляла ёй рэкрутаваць новых актывістаў, якія выступалі не столькі супраць эканамічнага ўціску, колькі супраць дэнацыяналізацыі і зневажальных адносін польскіх уладаў да беларускай меншасці.

Беларуская аснова КПЗБ пацвярджаецца і ўнутрыпартыйнай статыстыкай. Перад першым з'ездам у 1928 годзе ў мінскае прадстаўніцтва КПЗБ паступала аналітычная інфармацыя аб стане партыйных структур, якая дазваляла ў пэўнай ступені вызначыць нацыянальнае аблічча партыі. Паказальна, што звесткі паводле нацыянальнага складу партыі ў савецкай гістарыяграфіі ніколі не былі аб'ектам для навуковага аналізу. Так, на 1928 год у складзе КПЗБ было 1993 актывісты. Паводле нацыянальнага складу ў партыі налічваўся 71 % беларусаў, 13 % яўрэяў, 10 % украінцаў, 3 % палякаў і 3 % літоўцаў. Арыентаванасць менавіта на беларускі нацыянальны дыскурс партыі падкрэслівалася і колькасцю прапагандысцкіх друкаваных выданняў, 45 % якіх выдавалася на беларускай мове, 35 % – на рускай, 11 % – на ідыш. КПЗБ друкавала свае беларускамоўныя лістоўкі нават на лацініцы, каб пашырыць уплыў на беларускае каталіцкае насельніцтва, якое трады-

цыйна аддавала перавагу польскім палітычным структурам *[11, арк. 87, 88, 90, 261]*. Гэта статыстыка яшчэ раз пацвярджае нашу выснову, што, нягледзячы на інтэрнацыянальную рыторыку кіраўніцтва КПЗБ, у нізавых правінцыйных структурах партыі дамінаваў нацыянальны беларускі кампанент.

Увогуле сёння дастаткова цяжка выявіць дакладную колькасць сяброў КПЗБ. З прычыны сваёй нелегальнасці арганізацыя не мела партыйных білетаў, таму фактычна членства ў ёй рэгулявалася вуснымі рашэннямі. Кандыдатура кожнага новага сябра абмяркоўвалася актывістамі ячэйкі ці кіраўніцтвам раённых і акружных камітэтаў, пры гэтым мог усталёўвацца пэўны выпрабавальны тэрмін, падчас якога кандыдат павінен быў распаўсюджваць лістоўкі ці выконваць іншыя канспіратыўныя даручэнні *[1, с. 75]*. Штомесяц актывісты выплочвалі партыйныя ўзносы – 50 грошай з кожнага сябра, што з'яўлялася адносна невялікай сумай на тыя часы. Сабраныя грошы ішлі на розныя мэты – ад набыцця зброі да выплаты адвакатам, якія абаранялі актывістаў у судах *[14, арк. 141–143]*. У цэлым, унутрыпартыйная статыстыка сведчыць, што агульная колькасць сяброў партыі ў розныя часы вагалася ад дзвюх да трох тысяч чалавек, а колькасць найбольш апантаных і перакананых актывістаў магла дасягаць усяго 500 чалавек *[8, арк. 33]*.

КПЗБ у польскім прававым полі лічылася нелегальнай структурай, таму ў сваёй дзейнасці яна выкарыстоўвала адпаведныя метады і інструменты. Бадай ці не самай распаўсюджанай формай нелегальнай дзейнасці было вывешванне чырвоных транспарантаў з надпісамі. Актывісты партыі вывешвалі сцягі на тэлеграфных слупах, дрэвах, вясковых будынках і нават цэрквах. Часта яны дапаўняліся надпісамі на беларускай ці рускай мовах (вельмі рэдка – па-польску) рознага зместу: «Пралетарыі ўсіх краёў, яднайцеся!», «Далоў белы тэрор!», «Таварышы, прачніцеся і вазьміцеся за паноў», «Няхай жыве ўз'яднаная савецкая Беларусь». Напрыклад, у ноч з 13 на 14 верасня 1925 года ў вёсцы Раганічы (цяпер – у складзе Шчучынскага раёна) на закінутай стадоле з'явіўся чырвоны транспарант з надпісам «Смерць правакатарам і шпегам». Пасля праведзенага следства з графічнай экспертызай почарку быў арыштаваны мясцовы жыхар Антон Кузьміч. Да судовага разбіральніцтва таксама быў прыцягнуты солтыс вёскі, які раніцай першым заўважыў сцяг, зняў яго, прачытаў надпіс і павесіў на тое ж месца *[15, арк. 1366]*. Тым не менш польская паліцыя не заўсёды была гатова да падобных эксцэсаў і з'яўленне чырвонага транспаранта на галіне дрэва стала звыклай практыкай у заходнебеларускай вёсцы. Пік вывешвання сцягоў прыпаў на 1924–1925 гады, што стала адной з прычын маштабнай паліцэйскай акцыі па ліквідацыі структур КПЗБ на «ўсходніх крэсах» восенню 1925 года. Аднак падобная паліцэйская рэакцыя не спыняла заходнебеларускіх леварадыкалаў. У 1932 годзе толькі ў адным Навагрудскім павеце ноччу 7 лістапада было вывешана каля 70 сцягоў пераважна з беларускамоўнымі лозунгамі *[16, арк. 115]*.

Вывешванне транспарантаў актывістамі КПЗБ мела значнае эмацыйнае ўздзеянне на вясковых жыхароў і трымала мясцовую паліцыю ў пастаянным напружанні. Паліцэйскія чыноўнікі дакладвалі ў ваяводскія цэнтры,

**Лістоўка КПЗБ 1925 года**


Рабочыя і сяляне ўсіх краёў, яднайцеся!

Да рабочых і сялян прызыва 1904 года

Да салдат польскае арміі.

ТАВАРЫШЫ!

Вас пажэнуць у армію. У арміі, дзе салдат — сялянін і рабочы, а камандзір — афіцэр. Ваш адвечны вораг — польскі абшарнік ці буржуй! Вас беларускіх сялян, чыю зямлю гвалтам захапіў польскі абшарнік — аддаюць пад беззаконную самаволю афіцэршчына таго-ж абшарніка.

Там у панскіх казармах кулаком і грубой лаянкай будуць выбіваць з Вас думкі аб зямлі і ўладзе.

Там адарваных ад родных, Вас узброяць і навучаць на растрэльванне Вашых братоў і бацькоў, змагаючыхся за зямлю.

Там пад кіраўніцтвам паноў і ксяндзоў будуць Вас гнуціць і нагаварываць супроць Вашых братоў з Савецкае Беларусі.

Вас вывязуць ад гэтуль у глыб Польшчы і будуць там трымаць на пагатове каб ды [illegible] на панскай каманде стралялі у польскіх рабочых і сялян, якія змагаюцца за зямлю і ўладу.

Тут у Заходняй Беларусі, у сябе на вёсцы, мястэчку і горадзе вы зазналі ўсю цяжасць польскай акупацыі.

Польскі рабочыя і сяляне таксама пераносяць гібельнае прыгнячэнне польскага абшарніка і капіталіста.

Забастоўкі аб'яўляюцца на кожным шагу, але сілай войска і паліцыі польскі ўрад іх душыць.

ТАВАРЫШЫ!

Ідучы ў армію не забывайцеся, што вы перш-на-перш сяляне і рабочыя.

Ідучы ў армію не забывайцеся, што барацьба за зямлю і ўладу не кончана.

Знайце, што ў гэтай барацьбе перамога той, [illegible] на чыім баку будзе армія.

[illegible] Пераможуць абшарнікі і фабрыканты, калі Вы будзеце ім памагаць.

Пераможуць Вашыя бацькі і адбяруць зямлю і ўладу, калі Вы ўсе разам, усім з бокам адкажыцеся ў іх страляць і з аружжам у руках, навучаныя ваеннаму дзелу, перабіўшы ненавісных генералаў, перайдзеце на бок паўстаўшых [illegible] сялян.

Далоў буржуазна-абшарніцкі ўрад!

Няхай жыве еднасць салдат, рабочых і сялян!

Няхай жыве рэвалюцыя!

Цэнтр. Каміт. Камуніст. Партыі Заходняй Беларусі.

Вільня [illegible] 1925 года

што пасля з'яўлення сцяга ў той ці іншай мясцовасці сярод беларусаў панаваў настрой чакання вялікіх змен, а ў вёсках адбываліся зацікаўленыя размовы аб гэтых з'явах *[15, арк. 1415]*. Парадаксальна, але кавалак чырвонага матэрыялу з напісанымі пад трафарэт ці наўпрост ад рукі белымі літарамі для некаторых рэгіёнаў Заходняй Беларусі, куды не даходзіла беларуская прэса ці кніга, быў амаль адзіным сродкам публічнага пашырэння беларускай мовы ва ўмовах татальнай паланізацыі.

Яшчэ адной формай нелегальнай дзейнасці сяброў КПЗБ з'яўлялася распаўсюджванне ўлётак. У міжваеннай Польшчы ў розныя гады дзейнічала тры падпольныя друкарні КПЗБ – у Вільні, Гродне і Беластоку, – якія літаральна завальвалі заходнебеларускія вёскі і гарады прапагандысцкімі брашурамі, адозвамі, улёткамі і нелегальнымі газетамі на пяці мовах. Значная частка друкаванага матэрыялу таксама ішла з-за мяжы – паток прапагандысцкай літаратуры праз польска-савецкае памежжа быў амаль некантраляваны. Механізм кантрабанды агітацыйнай літаратуры сябрамі КПЗБ працаваў, як наладжаны гадзіннік. Праз мяжу яе правозілі фурманкамі мясцовыя жыхары, якія ў сярэднім за адзін рэйс маглі перавезці каля 60 кг друкаваных матэрыялаў, За гэта з партыйнай касы ім выплачвалася ад 60 да 80 злотых. Для параўнання: 1 кг свініны ў Польшчы на той час каштаваў прыблізна паўтара злотых *[17, арк. 12 адв.]*.

Польская паліцыя і памежнікі рабілі спробы прадухілення палітычнай кантрабанды, аднак гэта не давала свайго плёну да канца 1930-х гадоў. Агітацыйных улётак КПЗБ было так многа, што ў паліцэйскіх рапартах іх лічылі не штукамі, а кілаграмамі ці пудамі. Так, у аднаго актывіста з Маладзечанскага павета было знойдзена каля 30 кг адозваў і 2500 асобнікаў брашур і ўлётак на беларускай і яўрэйскай мовах *[17, арк. 8 адв.]*.

Ва ўлётках актывісты КПЗБ заклікалі не плаціць падаткі, адмаўляцца ад службы ў польскім войску і не адпраўляць дзяцей у польскія школы. Пры гэтым не заўсёды гэтыя адозвы проста раскідваліся на вуліцы. Адным з кірункаў партыйнай дзейнасці была так званая «хатняя агітацыя» – два-тры актывісты наўпрост хадзілі па сялянскіх хатах ці рабочых кварталах, размаўлялі з людзьмі на адпаведныя тэмы і раздавалі ім друкаваныя матэрыялы *[12, арк. 79]*.

Разам з тым беларускі левaрадыкальны рух у Заходняй Беларусі не цураўся выкарыстоўваць усе магчымыя палітычныя сродкі, у тым ліку легальныя, каб дамагчыся хоць мінімальнага прасоўвання сваіх ідэй сярод насельніцтва. Актывісты КПЗБ час ад часу выходзілі «з падполля» і прымалі ўдзел у выбарчых кампаніях у польскі сейм ці органы мясцовага самакіравання. У 1928 годзе дзякуючы намаганням левaрадыкалаў у польскі парламент было абрана пяць дэпутатаў-беларусаў, якія стварылі ў сейме беларускі пасольскі клуб «Змаганне» – фактычна легальную фракцыю КПЗБ у парламенце *[4, с. 400]*. Годам раней польскія ўрадавыя газеты білі трывогу, бо падчас выбараў у гмінныя рады (прататып сучасных беларускіх сельсаветаў) на «крэсах усходніх» шмат месцаў занялі беларусы, якія сімпатызавалі КПЗБ і іншым беларускім арганізацыям. Актывісты, якія трапілі ў мясцовае самакіраванне, прыносілі з сабой ідэі змяншэння мясцовых падаткаў, адкрыцця школ на роднай мове і фінансавання беларускіх ініцыятыў з мясцовых бюджэтаў, У некаторых мясцовасцях Заходняй Беларусі беларускія актывісты настолькі моцна апанавалі гмінныя рады, што мясцовае насельніцтва лічыла іх правобразам будучых беларускіх улад *[18, арк. 1]*.

Сябрам КПЗБ было вельмі важна сачыць за дзейнасцю польскіх улад, бо такім чынам яны вывучалі праціўніка знутры і былі, як ім здавалася, на крок наперад у супрацьстаянні. У верасні 1925 года ў лесе каля Вілейкі падпольна сабралася каля 10 чалавек, якія пастанавілі імкнуцца працаўладкавацца ў дзяржаўныя ўстановы, утрымліваць прыязныя стасункі з чыноўнікамі і паліцыяй дзеля кантралявання іх дзейнасці і намераў *[19, арк. 87]*. Колькі актывістаў КПЗБ працавала ў дзяржаўных структурах міжваеннай Польшчы, цяпер устанавіць складана, але такія выпадкі былі. Пры гэтым польскія ўлады адказвалі той жа тактыкай – у структуру КПЗБ пранікала безліч сакрэтных супрацоўнікаў, ці на мове таго часу – канфідэнтаў паліцыі. Яны дапамагалі ўладам абясшкоджваць падпольныя структуры партыі, канфіскоўваць агітацыйную літаратуру і перакрываць каналы яе дастаўкі, выступалі ў якасці правакатараў падчас розных палітычных акцый. У 1930-я гады шмат якія кірункі дзейнасці КПЗБ былі паралізаваны канфідэнтамі: свядомыя партыйныя актывісты ўжо не змагаліся з «класавымі ворагамі» ці польскімі ўладамі, а ўвесь час шукалі ў сваіх шэрагах правакатараў і даносчыкаў *[16, арк. 80 адв.]*.

У 1938 годзе КПЗБ, як і Камуністычная партыя Польшчы, паводле рашэння Камінтэрна была распушчана з прычыны вялікай колькасці канфідэнтаў паліцыі ў партыйных структурах. Тым не менш былыя актывісты захоўвалі сувязі паміж сабой і выношвалі планы адраджэння арганізацыі пад іншай назвай. Многія з іх у канцы 1930-х гадоў знаходзіліся ў польскіх турмах і былі вызвалены толькі пасля ўваходжання савецкіх войск у Заходнюю Беларусь. Аб'яднанне беларускіх земляў у верасні 1939 года былыя сябры КПЗБ сустрэлі з вялікай надзеяй і пазітывам, віталі новыя ўлады і самі прымалі актыўны ўдзел у станаўленні часовых органаў кіравання *[20, с. 387]*.

Пасля верасня 1939 года лёсы былых сябраў КПЗБ разышліся. Адны актыўна далучыліся да савецкага ладу жыцця, увайшлі ў сталінскую палітычную сістэму і адчулі сацыяльныя ліфты новых улад. Прыкладам тут можа быць біяграфія Веры Валейка – актывісткі КПЗБ з Вялікай Бераставіцы, якая ў 1940-я гады стала дэпутатам Вярхоўнага савета БССР і партыйным функцыянерам у Пінску *[20, с. 390]*. Другія сталі ахвярамі неабаснаваных палітычных рэпрэсій па абвінавачванню ў супрацоўніцтве з польскімі ўладамі. Хтосьці з былых сяброў КПЗБ у гады Другой сусветнай вайны пачаў супрацоўнічаць з нямецка-фашысцкімі акупантамі і імкнуўся выкрасліць сваё камуністычнае мінулае з біяграфіі, як, напрыклад, Юльян Саковіч – начальнік мінскай паліцыі ў часы акупацыі, які быў забіты акаўцамі ў 1943 годзе *[21]*.

Пасля вайны ў новых савецкіх умовах былыя члены КПЗБ былі ўнікальным прыкладам салідарнасці і партыйнага «брацтва». Актывісты, якія праніклі на вышэйшыя паверхі ўлады ў БССР (Максім Танк, Сяргей Прытыцкі), дапамагалі сваім ранейшым аднапартыйцам вырашаць розныя праблемы, у тым ліку звязаныя з рэабілітацыяй пасля сталінскіх рэпрэсій.

Падводзячы вынікі, трэба падкрэсліць, што КПЗБ з'яўлялася важнай часткай беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў міжваеннай Польшчы, які разглядаецца намі як цэласная ўзаемазалежная сістэма. Партыю нельга вылучаць з гэтай сістэмы ў якасці асобнага цэнтра, як гэта рабілася, напрыклад, у савецкай гістарыяграфіі, аднак неабходна ўяўляць значэнне КПЗБ для беларускага руху ў цэлым. Згодна з праграмнымі дакументамі партыя пазіцыянавала сябе як камуністычная структура ленінскага ўзору, аднак насамрэч з'яўлялася кангламератам розных кірункаў тагачаснага левардыкальнага дыскурсу. Пры гэтым, нягледзячы на інтэрнацыянальную рыторыку кіраўнічага яруса арганізацыі, на нізавых структурах КПЗБ дамінавалі нацыянальныя настроі. Большасць партыйных актывістаў складалі маладыя беларусы, якія імкнуліся супраціўляцца дэнацыяналізацыі з боку польскіх улад. Нацыянальны пасыл КПЗБ, які раней гісторыкамі фактычна ігнараваўся, цяпер неабходна разглядаць як праяву развіцця нацыянальнай свядомасці беларусаў і прыклад іх барацьбы за нацыянальную дзяржаўнасць.

***Фотаілюстрацыі прадастаўлены Дзяржаўным архівам Гродзенскай вобласці***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 10.06.2021 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.]. – Минск: Беларусь, 1966. – 401 с.
2. Глинская, Т. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии, 1924–1928 гг. / Т. Глинская. – Минск: Беларусь, 1965. – 200 с.
3. Савіч, А.А. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў: манаграфія / А.А. Савіч. – Брэст: БрДУ, 2019. – 300 с.
4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
5. Полуян, В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. Полуян, И. Полуян. – Минск: Госиздат БССР, 1962. – 224 с.
6. Зелинский, П.И. Политическая работа КПЗБ в массах 1923–1938 гг. / П.И. Зелинский. – Минск: Университетское, 1986. – 136 с.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 291.
8. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 266.
9. Rudling, P. The rise and fall of elarusian nationalism 1906–1931 / P. Rudling. – Pittsburgh: University of Pittsburgh Press, 2015. – 436 p.
10. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 52. Воп. 1. Спр. 128.
11. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 189.
12. ДАГВ. – Ф. 22. Воп. 1. Спр. 137.
13. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 25.
14. ДАГВ. – Ф. 52. Воп. 1. Спр. 124.
15. ДАГВ. – Ф. 200. Воп. 1. Спр. 17.
16. ДАГВ. – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 10.
17. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна (ЗДАМ). – Ф. 10. Воп. 1. Спр. 103.
18. ДАГВ. – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 3.
19. ЗДАМ. – Ф. 10. Воп. 1. Спр. 77.
20. Годы испытаний и мужества / Сост.: Н.С. Орехво, Н.С. Сташкевич. – Минск: Беларусь, 1973. – 416 с.
21. Ильин, А. Судьбы бывших членов КПЗБ после сентября 1939 года: Юлиан Сакович – путь от коммуниста до белорусского националиста / А. Ильин // Wrocławskie Studia Wschodnie. – 2013. – Т. 17. – С. 237–249.